# СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

БОЛЬШ УВАГІ РАБФАКУ ● ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ ЗІМОВАЙ ЭКЗАМЕНАЦЫЙНАЙ СЕСІІ ● УСЕСАЮЗНЫ ФОРУМ ГІСТОРЫКАЎ-СЛАВІСТАЎ ● ПЛАН ПЕРАВЫКАНАН ● КАМСАМОЛЬСКАЯ СТАРОНКА: АКТЫЎНАСЦЬ ПЛЮС ДЗЕЛАВІТАСЦЬ ● ПАСТАНОВА БЮРО КАМІТЭТА КАМСАМОЛА ● МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА ПРАВЯДЗЕННЮ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЙ АТЭСТАЦЫІ ● ДА 100-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ М. І. УЛЬЯНАВАЙ ● ПЕДАГАГІЧНЫЯ ВЕДЫ — У ЖЫЦЦЁ ● ПЛАТА ЗА ДЫПЛОМ ● АПЕРАЦЫЯ «ЗДАРОЎЕ» ● ЛЕКЦЫІ Ў ЧАС АДПАЧЫНКУ ● У СПОРТА СВАЯ ГІСТОРЫЯ ● ЛІТАРАТУРА, ПАСТУПІЎШАЯ Ў КАБІНЕТ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫХ І ГІСТАРЫЧНЫХ НАВУК ● АБ'ЯВЫ

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 6 (1193) ● 16 лютага 1978 г. Цана 2 кап.

ПА БДУ
інфармацыя

## Усесаюзны форум гісторыкаў-славістаў

**У НАШАЙ КРАІНЕ ТРАДЫЦЫЯЙ СТАЛІ СУСТРЭЧЫ ГІСТОРЫКАЎ-СЛАВІСТАЎ. ЯНЫ ПРАХОДЗЯЦЬ У РОЗНЫХ ГАРАДАХ — ЛЬВОВЕ, ХАРКАВЕ, ЧАРНАЎЦАХ І ІНШ.**

1—4 лютага ў Данецку адбылася VIII Усесаюзная канферэнцыя гісторыкаў-славістаў. Яна была арганізавана вядучымі ВНУ краіны. У аргкамітэт па правядзенню канферэнцыі ад Беларускага універсітэта уваходзіў прафесар Д. Б. Мельцар.

На усесаюзны форум гісторыкаў-славістаў сабралася 230 чалавек з 85 ВНУ і устаноў 51 горада краіны. Былі заслуханы 31 даклад і 139 паведамленняў.

Работа канферэнцыі была арганізавана па секцыях у праблемна-храналагічным парадку. Дзейнічалі такія секцыі, як «Вялікі Кастрычнік і праблемы гісторыі славянскіх народаў у міжваенны перыяд», «Будаўніцтва сацыялізму ў замежных славянскіх краінах», «Нацыянальна-вызваленчы рух славянскіх народаў» і інш. У рабоце секцый актыўны ўдзел прыняла вялікая група славістаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта. З паведамленнямі выступілі дэкан гістарычнага факультэта прафесар І. В. Царук, загадчык кафедры гісторыі філасофіі прафесар А. С. Кляўчэня, дацэнты Л. В. Лойка, П. К. Краўчанка, В. В. Бянькоўскі, аспіранты Т. Г. Шман, Р. Р. Лазько, Т. А. Слабуха, Г. А. Каслач і іншыя. У канферэнцыі ўдзельнічала 14 прадстаўнікоў універсітэта. Сустрэча гісторыкаў-славістаў у Данецку прайшла на высокім навуковым узроўні. У выступленнях узнімаліся актуальныя пытанні славяназнаўства, праблемы яго развіцця і каардынацыі. Канферэнцыя прыняла рашэнне правесці IX Усесаюзную канферэнцыю гісторыкаў-славістаў у г. Краснадары.

**Т. А. СЛАБУХА,**
**аспірантка кафедры новай і навейшай гісторыі БДУ.**

## План перавыканан

**ДОБРЫМІ АКАЗАЛІСЯ ВЫНІКІ ПАДПІСКІ НА ПЕРЫЯДЫЧНЫ ДРУК НА 1978 ГОД.**

Асабліва шмат жадаючых было падпісацца на партыйныя газеты і часопісы. У параўнанні з мінулым годам план падпіскі выканан (у працэнтах):

«Правда» — 114

«Звязда» — 109

«Мінская праўда» — 138

«Экономическая газета» — 105

«Известия» — 111

«Советская Белоруссия» — 124.

На партыйныя часопісы план падпіскі выканан на 115 працэнтаў (у параўнанні з мінулым годам).

**А. РУКШЫН,**
старшыня савета па падпісцы пры парткоме БДУ імя У. І. Леніна.

# Больш увагі рабфаку

Права на адукацыю ў нашай краіне гарантавана Канстытуцыяй СССР. Ім шырока карыстаюцца прадстаўнікі ўсіх слаёў насельніцтва.

Сярод абітурыентаў БДУ імя У. І. Леніна, а пазней і студэнтаў-першакурснікаў нямала ўчарашніх маладых рабочых і калгаснікаў. Ім цяжэй, зразумела, увайсці ў рытм жыцця універсітэта, узнавіць веды, атрыманыя ў сярэдняй школе. Для таго, каб дапамагчы перадавым рабочым і калгаснікам паступіць у ВНУ і аблегчыць моладзі з працоўных калектываў працэс адаптацыі ў студэнцкім асяроддзі, былі створаны рабочыя факультэты — падрыхтоўчыя аддзяленні. За восем год работы рабфак БДУ накапіў пэўны вопыт і передаў ва універсітэт больш 2 тысяч сваіх выхаванцаў, падрыхтаваных да вучэбнага працэсу і рытму работы на факультэтах.

Бягучы навучальны год на падрыхтоўчым аддзяленні пачаўся ў асабліва знамянальны час—у юбілейным 1977 годзе. Гэта год 60-годдзя Вялікага Кастрычніка і прыняцця новай Канстытуцыі СССР — Канстытуцыі будаўнікоў камунізму.

Восем месяцаў заняткаў на аддзяленні — гэта не проста паўтарэнне школьнай праграмы. Лекцыі, семінары, калёквіумы — усё гэта для таго, каб заўтрашнія студэнты хутчэй акліматызаваліся і прывыклі да строгіх патрабаванняў вышэйшай навучальнай установы.

У 1977 годзе слухачамі падрыхтоўчага аддзялення сталі 350 чалавек, сярод якіх ёсць дэпутаты гарадскіх і сельскіх Саветаў, ударнікі камуністычнай працы, пераможцы сацыялістычнага спаборніцтва 1976 года, гвардзейцы пяцігодкі, выдатнікі баявой і палітычнай падрыхтоўкі. Трэцяя частка ўсіх слухачоў — камуністы.

Тым не менш пытанні камплектавання аддзялення патрабуюць далейшага ўдасканальвання. За апошнія гады значна знізіўся конкурс на прыродазнаўчыя спецыяльнасці. З мэтай прыцягнення да вучобы перадавых рабочых і калгаснікаў і паляпшэння конкурснага адбору мэтазгодна, відавочна, дэканатам, кафедрам і грамадскім арганізацыям факультэтаў заключаць планы-дагаворы з прамысловымі прадпрыемствамі, устанаўліваць сувязі з камандаваннем вайсковых падраздзяленняў, праводзіць сустрэчы на заводах і фабрыках з маладымі рабочымі. З мэтай больш шырокага прыцягнення на падрыхтоўчае аддзяленне найбольш дастойнай перадавой моладзі з ліку рабочых, калгаснікаў і дэмабілізаваных з радоў Савецкай Арміі калектывам факультэтаў неабходна ўжо зараз пачаць вялікую агітацыйную работу на прадпрыемствах, будоўлях і ў вайсковых падраздзяленнях, а не ў канцы кастрычніка, калі ўжо становіцца відавочным зрыў дзяржаўнага плана прыёму працоўнай моладзі. Дэканаты факультэтаў не выкарыстоўваюць магчымасці абласных, гарадскіх і шматтыражных газет, радыё і тэлебачання для прафесійнай арыентацыі, растлумачвання парадку і правілаў прыёму слухачоў на падрыхтоўчае аддзяленне.

Якасць навучання на рабфаку залежыць перш за ўсё ад педагогаў. Выкладчыцкая дзейнасць тут вельмі складаная, своеасаблівая, яна патрабуе сапраўднага майстэрства, творчага пошуку. Таму большасць выкладчыкаў — гэта найбольш кваліфікаваная частка супрацоўнікаў кафедр.

Зразумела, што толькі зацікаўленая дапамога дэканатаў, кафедр і грамадскіх арганізацый факультэтаў зможа забяспечыць высокую якасць навучання. Як вядома, дзейнасць падрыхтоўчага аддзялення разглядаецца рэктаратам і парткомам як састаўная частка агульнай вучэбна-выхаваўчай работы універсітэта. Праяўляць пастаянны клопат аб вучобе, жыцці, быце маладых рабочых і калгаснікаў — гэта прамы абавязак дэканатаў, кафедр і грамадскіх арганізацый факультэтаў. Адпаведныя кафедры павінны аказваць сістэматычную дапамогу выкладчыкам, якія працуюць на рабфаку ў арганізацыі вучэбнага працэсу. Трэба смялей укараняць найбольш перадавыя формы выкладання дысцыплін, далучаць слухачоў да метадаў навучання ў ВНУ, у тым ліку і да лекцыйнай сістэмы, абавязкова выкарыстоўваць тэхнічныя сродкі навучання, якія маюць кафедры універсітэта. Патрэбна шырэй далучаць да правядзення індывідуальных заняткаў і кансультацый выкладчыкаў, аспірантаў і студэнтаў-выдатнікаў.

Значнае месца ў ідэйна-выхаваўчай рабоце займае прафесійная арыентацыя навучэнцаў. З гэтай мэтай важна знаёміць слухачоў з факультэтамі, іх гісторыяй, традыцыямі, з кафедрамі і іх вучонымі. Знаёміць так, як гэта робіцца, напрыклад, на гістарычным факультэце. Тут дэканат, партбюро, прафбюро пастаянна падтрымліваюць сувязь з рабфакаўцамі на працягу ўсяго перыяду навучання. Слухачы групы гісторыкаў далучаюцца да грамадскай і культурна-масавай работы на факультэце.

На падрыхтоўчым аддзяленні робіцца ўсё, каб працоўная моладзь набыла трывалыя веды для паспяховай вучобы ва універсітэце. Кафедры вылучаюць падрыхтоўчаму аддзяленню сваіх лепшых выкладчыкаў. Цяжкасці, безумоўна, ёсць. Не так проста ўключыцца ў вучобу пасля 3—5-гадовага перапынку. Але выкладчыкі маюць справу з працоўнай моладдзю, якая прайшла школу працоўнай загартоўкі, моладдзю грамадска актыўнай, з людзьмі моцнай волі і цвёрдага характару, якія паставілі перад сабою канкрэтную мэту. Усё гэта вельмі важна.

Партыя і ўрад разглядаюць рабфакі як важны рэзерв папаўнення студэнцтва людзьмі, якія маюць дастатковы працоўны і жыццёвы вопыт, перадавікамі вытворчасці, камуністамі і камсамольцамі. Дэканатам, партыйным, камсамольскім і прафсаюзным арганізацыям неабходна прыкласці ўсе сілы, каб рабфакаўцы паспяхова справіліся з ускладзенымі на іх адказнымі задачамі.

Выхаванцы рабфака павінны быць прыкладам у авалоданні арсеналам сучасных ведаў на працягу ўсяго перыяду навучання ва універсітэце, дастойна прадстаўляць тыя працоўныя калектывы, якія далі ім пуцёўку ў ВНУ.

**А. КАЖУШКОЎ,**
**дэкан падрыхтоўчага аддзялення.**

**М. ЧУДАЕЎ,**
**намеснік дэкана.**



На здымку: дацэнт юрфака А. А. Шынгель задаволены адказам студэнткі IV курса Р. Навакуньскай.

(Фотарэпартаж з экзамена па калгаснаму праву на юрфаку глядзі на 2—3 стар.).

**Фота В. ДРАЧОВА.**

# ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ ЗІМОВАЙ СЕСІІ

**Нядаўна закончылася чарговая зімовая сесія ў студэнтаў БДУ.**

**— Якія вынікі сесіі? — з такім пытаннем звярнуліся мы ў вучэбную частку універсітэта.**

**— У цэлым, —адказвае Р. В. Дазмарава, старшы метадыст вучэбнага аддзела, — вынікі сесіі станоўчыя. У параўнанні з зімовай сесіяй мінулага навучальнага года паспяховасць павысілася і склала па універсітэту 93,72 працэнта (у 1976 — 77 навучальным годзе 93,11 працэнта).**

**Самай высокай паспяховасці дабіўся юрыдычны факультэт (98,53 працэнта). На другім месцы па паспяховасці — гістарычны факультэт (98,32 працэнта), на трэцім —факультэт журналістыкі (98,05 працэнта).**

**Значна павысілася паспяховасць на механіка-матэматычным факультэце: калі ў мінулую зімовую сесію яна склала 89,86 працэнта, то ў гэтую сесію — 94,10.**

**Самая нізкая паспяховасць — на факультэце прыкладной матэматыкі (89,36 працэнта). На фізічным факультэце яна склала 90,84 працэнта, на факультэце радыёфізікі і электронікі — 92,38, геаграфічным — 93,23, філалагічным — 93,52 і біялагічным — 95,34 працэнта.**

**Падведзены вынікі здачы экзаменаў і залікаў па грамадскіх дысцыплінах. Стопрацэнтная паспяховасць у студэнтаў па філасофіі, навуковаму атэізму і марксісцка-ленінскай этыцы. Па гісторыі КПСС яна склала 97,41 працэнта, палітэканоміі — 98,39, навуковаму камунізму — 99,04 працэнта.**

# АКТЫЎНАСЦЬ ПЛЮС ДЗЕЛАВІТАСЦЬ

Ленінскі залік — новая з'ява ў жыцці камсамольскіх арганізацый. Ужо амаль на працягу дзесяці год ён знаходзіцца ў арсенале найбольш масавых і эфектыўных форм камсамольскай работы, стаў важнейшай састаўной часткай усёй сістэмы камуністычнага выхавання моладзі, эфектыўным сродкам павышэння працоўнай і грамадска-палітычнай актыўнасці камсамольцаў і несаюзнай моладзі, сістэмай, якая дазваляе забяспечыць адзінства ідэйна-палітычнага і працоўнага выхавання юнакоў і дзяўчат. Па вобразнай заўвазе Я. М. Цяжэльнікава, «Ленінскі залік дазваляе камсамольцам супаставіць сваё жыццё, учынкі з ленінскай думкай, справамі партыі, а камсамольскаму калектыву ацаніць працу, вучобу, маральныя пазіцыі, грамадскую актыўнасць юнакоў і дзяўчат, выкананне ленінскага запавета «вучыцца камунізму» ў святле сучасных патрабаванняў партыі».

Важнай састаўной часткай Ленінскага заліку ў ВНУ з'яўляецца грамадска-палітычная практыка студэнтаў. Зыходзячы з вопыту мінулых гадоў, па рашэнню савета універсітэта арганізацыя і правядзенне грамадска-палітычнай практыкі і атэстацыі па яе выніках былі сумешчаны з работай па правядзенню Ленінскага заліку. Гэта дае магчымасць найбольш поўна і ўсебакова абмеркаваць і ацаніць удзел кожнага студэнта ва ўсіх сферах дзейнасці камсамольскай арганізацыі.

Правядзенне грамадска-палітычнай атэстацыі ва універсітэце ў кароткі тэрмін — з 18 па 28 лютага — абавязвае ўсе грамадскія арганізацыі факультэтаў правесці вялікую і карпатлівую работу. Перш за ўсё неабходна звярнуць самую сур'ёзную ўвагу на зацвярджэнне атэстацыйна-метадычных камісій, распрацоўку дакладных графікаў правядзення атэстацыі. Дэканатам і акадэмкамісіям камітэтаў ЛКСМБ і прафбюро факультэтаў трэба падрыхтаваць звесткі аб паспяховасці і дысцыпліне, удзеле ў грамадскай рабоце, у СНТ кожнага студэнта. Асаблівую ўвагу звярнуць на аб'ектыўнае складанне характарыстык на таго ці іншага камсамольца. Сама атэстацыя павінна насіць характар гутаркі з кожным камсамольцам у абстаноўцы, калі добразычлівасць і давер'е спалучаюцца з прынцыповасцю і патрабавальнасцю. Не толькі члены камісіі, але і прысутнічаючыя ўдзельнікі заліку павінны прымаць актыўны ўдзел у размове. Бо думкі таварышаў, аднагодкаў таксама маюць важнае значэнне, як і думкі самай аўтарытэтнай камісіі.

Вышэйшай адзнакай грамадска-палітычнай актыўнасці камсамольца можа і павінна лічыцца рашэнне стаць пераможцай першага этапа за права падпісаць Рапарт ЦК КПСС да 60-годдзя Ленінскага камсамола.

Вельмі важна, каб грамадска-палітычная атэстацыя стала сапраўдным святам, хвалюючай размовай аб жыцці студэнцкай групы, аб шляхах вырашэння праблем. Грамадска-палітычная атэстацыя — гэта не толькі справаздача канкрэтнага студэнта-камсамольца, гэта і экзамен на згуртаванасць калектыву, экзамен на дружбу і актыўнасць.

У ходзе мінулых этапаў Ленінскага заліку і грамадска-палітычнай атэстацыі нарадзілася нямала добрых традыцый і пачынанняў. Хочацца верыць, што і ў годзе камсамольскіх з'ездаў паявіцца шмат добрых ініцыятыў, накіраваных на дастойную сустрэчу 60-годдзя слаўнага Ленінскага камсамола, 60-годдзя КПБ і БССР.

**М. ПРЫГОДЗІЧ,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта.**

# М. І. Ульянава

18 лютага спаўняецца 100 год з дня нараджэння **М. І. УЛЬЯНАВАЙ** (1878—1937), актыўнай удзельніцы рэвалюцыйнага руху, савецкага, партыйнага і дзяржаўнага дзеяча, журналісткі, сястры і бліжэйшага памочніка У. І. Леніна.

Ішоў 1919 год. Рабселькораўскі рух разрастаўся. Ужо не адзінкі і не дзесяткі, а сотні і тысячы працоўных і сялян актыўна, бясплатна, бескарысліва дапамагалі роднай «Праўдзе», былі яе вачыма, вушамі, гонарам і сумленнем. «Хроснай» маці рабселькораўскага руху была Марыя Ільінічна. «Ільінічна ў крыўду не дасць», — гаварылі праўдзісты. І гэта так і было. Усё, што датычала «Праўды», інтарэсаў газеты, яе карэспандэнтаў, знаходзілася пад наглядам Марыі Ільінічны.

Рабселькораў станавілася ўсё больш і больш. Клуб актывістаў «Праўды» працаваў бурна. Ішла ўпартая вучоба, дыспуты, знаёмства з вядомымі дзеячамі партыі і краіны. Кожны рабселькор, калі ён паяўляўся ў сталіцы, лічыў сваім абавязкам пабываць у клубе «Праўды». На агеньчык заходзілі і вопытныя, шмат пабачыўшыя літаратары, і пачынаючыя журналісты. А Марыі Ільінічне здавалася, што не ўсё зроблена, што работа можа ісці лепш. «Праўда» была яе дзецішчам, і яна пастаянна старалася ажывіць яе новым пачынаннем.

Неяк яна пачула частушку і прынесла яе Леніну як гасцінец:

Я была кухаркой,
Жарила котлеты,
А теперь в Совете
Издаю декреты.

Уладзімір Ільіч радасна смяяўся над «гасцінцам» і потым часта прасіў паўтарыць частушку.

У рэдакцыі Марыя Ільінічна не супраць была паслухаць песню, добрыя вершы, вясёлы расказ ці анекдот. Сама Марыя Ільінічна была на рэдкасць жыццярадасным чалавекам. Як умела яна смяяцца — заразліва, да слёз! У гэты момант асабліва цудоўныя былі яе вочы, зусім маладыя і вясёлыя.

Яна любіла песні, асабліва рэвалюцыйныя і народныя, тыя, што спявала ўпаўголаса ў турмах і ссылках.

Песня была для яе адлюстраваннем думкі і сэрца. Песня была з ёй усё жыццё. І жыццё яе было як песня.

**У. ДЗЯГІЛЕЎ.**
**(З кнігі «Сястра Ільіча»).**

# ПАСТАНОВА

**БЮРО КАМІТЭТА КАМСАМОЛА БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА «АБ ЗАДАЧАХ КАМІТЭТАЎ КАМСАМОЛА І КАМСАМОЛЬСКІХ БЮРО ФАКУЛЬТЭТАЎ ПА ПАСПЯХОВАМУ ПРАВЯДЗЕННЮ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЙ АТЭСТАЦЫІ ЧЛЕНАЎ КАМСАМОЛЬСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА».**

У адпаведнасці з рашэннем V пленума ЦК ВЛКСМ (сакавік 1976 г.) у гады дзесятай пяцігодкі ў камсамольскіх арганізацыях краіны праводзіцца Ленінскі залік «Рашэнні XXV з'езда КПСС — у жыццё!». Штогод па выніках кожнага этапа праводзіцца грамадска-палітычная атэстацыя камсамольцаў. Рашэннем савета універсітэта ад 21 лютага 1977 года арганізацыя і правядзенне грамадска-палітычнай практыкі і атэстацыі па яе выніках былі сумешчаны з работай па правядзенню Ленінскага заліку.

Грамадска - палітычную атэстацыю па выніках 1977 года неабходна правесці з 18 па 28 лютага 1978 г. Для правядзення гэтага важнага мерапрыемства на высокім арганізацыйна - палітычным узроўні неабходна прарабіць значную арганізатарскую і прапагандысцкую работу. Камітэты камсамола факультэтаў, улічваючы вопыт мінулагодняй атэстацыі, павінны з усёй сур'ёзнасцю і прынцыповасцю аднесціся да арганізацыі атэстацыйна - метадычных камісій, звярнуць асаблівую ўвагу на максімальную зацікаўленасць кожнага члена камісіі не толькі ў выніках самой атэстацыі, але і ў якасным паляпшэнні праходжання грамадска - палітычнай практыкі студэнтамі акадэмічных груп. Неабходна дабівацца, каб кожная справаздача камсамольцаў стала прадметам усебаковага абмеркавання не толькі членамі камісій, але і таварышамі па працы і вучобе. Атэстацыю трэба праводзіць у форме камсамольскіх сходаў груп. Да пытанняў атэстацыі таго ці іншага камсамольца неабходна падыходзіць з пункту гледжання таго, як, у які бок змяніліся яго асноўныя паказчыкі ў параўнанні з мінулагодняй грамадска-палітычнай практыкай, ці ёсць пэўны зрух у яго рабоце, якія новыя якасці набыў ён у ходзе другога этапа Ленінскага заліку і ГПП. Пры правядзенні атэстацыі неабходна ўсебакова ўлічваць індывідуальныя асаблівасці студэнтаў; тут недапушчальны фармалізм, шаблон. Ні ў якім выпадку нельга ператвараць атэстацыю ў экзамен.

Камітэты камсамола факультэтаў павінны выкарыстоўваць грамадска - палітычную атэстацыю ў якасці аднаго з найбольш важных сродкаў павышэння грамадска-палітычнай актыўнасці студэнтаў, як адну з форм пошуку новых шляхоў і метадаў работы пярвічных камсамольскіх арганізацый.

З мэтай паспяховага правядзення грамадска-палітычнай атэстацыі членаў камсамольскай арганізацыі універсітэта бюро камітэта камсамола пастанаўляе:

1. На пасяджэннях камітэтаў камсамола факультэтаў да 16 лютага ўдакладніць графікі правядзення атэстацыі.

2. Камітэтам ЛКСМБ факультэтаў да 15 лютага 1978 г. перагледзець і зацвердзіць сумесным рашэннем з партыйным бюро і дэканатамі састаў і старшынь атэстацыйна-метадычных камісій (для кожнай акадэмічнай групы). У састаў камісіі павінны ўваходзіць члены камітэта камсамола факультэта, камсорг групы, стараста.

3. Ідэалагічнаму аддзелу камітэта камсамола БДУ правесці вучобу ўсіх камсамольскіх актывістаў універсітэта і прадстаўнікоў атэстацыйных камісій 15 лютага па пытанню задач і методыкі правядзення грамадска-палітычнай атэстацыі.

4. Асаблівую ўвагу камітэтам камсамола факультэтаў звярнуць на правядзенне атэстацыі на першых курсах. За кожнай акадэмічнай групай першага курса замацаваць членаў камітэта камсамола факультэта і універсітэта.

5. Камітэтам камсамола факультэтаў прыняць неабходныя меры да маляўнічага афармлення памяшканняў, дзе будуць праходзіць пасяджэнні атэстацыйных камісій. Ход грамадска-палітычнай атэстацыі штодзённа адлюстроўваць у друку (маланках, баявых лістках, бюлетэнях, фотагазетах).

6. Прадстаўнікам камітэтаў камсамола факультэтаў мець неабходны запас даручэнняў на пасяджэннях атэстацыйна - метадычных камісій.

7. Асабістыя комплексныя планы студэнтаў на 1978 год павінны быць распрацаваны з удзелам атэстацыйна-метадычных камісій, абмеркаваны і зацверджаны на камсамольскіх сходах да 15 сакавіка 1978 года.

8. Вынікі грамадска-палітычнай атэстацыі абмеркаваць на пасяджэннях камсамольскіх бюро факультэтаў і камітэта камсамола універсітэта да 15 красавіка 1978 года.

9. Камітэтам камсамола факультэтаў да 10 сакавіка прадставіць спісы лепшых студэнтаў для ўзнагароджання граматамі камсамольскіх органаў, значком ЦК ВЛКСМ «Ленінскі залік».

10. Патрабаваць ад кожнага камсамольца пры правядзенні грамадска-палітычнай атэстацыі праект асабістага комплекснага плана на новы перыяд.

11. Бюро камітэта камсамола БДУ імя У. І. Леніна выказвае ўпэўненасць у тым, што камітэты камсамола факультэтаў прыкладуць усе намаганні да таго, каб правесці грамадска - палітычную атэстацыю студэнтаў на высокім арганізацыйным і грамадска-палітычным узроўні.

12. Кантроль за выкананнем гэтай пастановы ўскласці на ідэалагічны аддзел камітэта камсамола універсітэта (Прыгодзіч М.).





Добры настрой панаваў на юрыдычным факультэце ў час зімовай экзаменацыйнай сесіі. І гэта зразумела: добрая падрыхтоўка, сканцэнтраванасць, трывалыя веды далі магчымасць студэнтам паспяхова здаць экзамены і залікі. Па выніках сесіі юрфак дасягнуў самай высокай паспяховасці ва універсітэце.

На здымках:

экзамен па калгаснаму праву ў студэнтаў IV курса юрфака прымае дацэнт А. А. Шынгель;

галоўнае — сканцэнтравацца;

прыемна атрымоўваць выдатныя адзнакі;

адказвае студэнтка Г. Габрусь.

Фота **В. Драчова.**

# ПЕДАГАГІЧНЫЯ ВЕДЫ—У ЖЫЦЦЁ

Адбылося пасяджэнне прэзідыума педагагічнага таварыства БДУ, на якім абмеркаваны надзённыя пытанні педагагічнай прапаганды. Размова ішла аб выніках кастрычніцкага (1977) Пленума ЦК КПСС, нечарговай сёмай сесіі Вярхоўнага Савета СССР і задачах педтаварыстваў, якія вынікаюць з даклада Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Вярхоўнага Савета СССР, Старшыні Канстытуцыйнай камісіі таварыша Л. І. Брэжнева «Аб праекце Канстытуцыі (Асноўнага Закона) Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік і выніках яго ўсенароднага абмеркавання» і даклада таварыша Л. І. Брэжнева «Вялікі Кастрычнік і прагрэс чалавецтва» на ўрачыстым пасяджэнні ЦК КПСС, Вярхоўнага Савета СССР і Вярхоўнага Савета РСФСР, прысвечаным 60-годдзю Вялікага Кастрычніка.

Прэзідыум педагагічнага таварыства БДУ адзначыў, што члены педтаварыства кафедры педагогікі з вялікім задавальненнем успрынялі вынікі нечарговай сёмай сесіі Вярхоўнага Савета СССР, даклад таварыша Л. І. Брэжнева, новую Канстытуцыю СССР. Абмеркаванне праекта Канстытуцыі СССР, яе прыняцце выклікалі вялікі палітычны і працоўны ўздым, накіраваны на выкананне рашэнняў XXV з'езда КПСС у галіне народнай адукацыі.

Супрацоўнікі кафедры педагогікі ўспрынялі Асноўны Закон як знамянальны палітычны і ідэйна-тэарэтычны дакумент сучаснасці. З пачуццём вялікага задавальнення і законнага гонару члены кафедральнага педагагічнага таварыства адзначылі ўключэнне ў Канстытуцыю СССР палажэнняў аб абавязковай сярэдняй адукацыі, камуністычным выхаванні дзяцей і моладзі, працоўным навучанні і выбары прафесіі, бясплатную выдачу школьнікам падручнікаў, разглядаючы ўсё гэта як новае праяўленне клопату партыі і дзяржавы аб падрастаючым пакаленні нашай Радзімы.

Прэзідыум педагагічнага таварыства адзначыў, што кафедральным педагагічным таварыствам праароблена вялікая работа па прапагандзе дасягненняў савецкай педагагічнай навукі, абагульненню і распаўсюджанню перадавога педагагічнага вопыту, павышэнню прафесіянальнага майстэрства настаўнікаў, выкладчыкаў і выхавацеляў, па аказанню дапамогі органам народнай адукацыі і педагагічным калектывам ва ўдасканаленні вучэбна-выхаваўчага працэсу.

Адобрана практычная рэалізацыя сувязі кафедральнага педтаварыства з працоўнымі калектывамі і грамадскасцю, у прыватнасці ў форме лекторыя для настаўнікаў і бацькоў г. Мінска і Мінскай вобласці (тэмы: «XXV з'езд КПСС і комплексны падыход да выхавання», «Новая Канстытуцыя СССР —асноўны закон развіцця сацыялізму» і іншыя, а таксама шэфская работа з настаўнікамі сельскіх школ Чэрвеньскага раёна пад дэвізам «Кафедра педагогікі БДУ — сельскай школе»).

Сіламі кафедральнага педтаварыства ў 1977 годзе прачытана 110 лекцый, цэнтральнай тэмай якіх з'яўляліся прапаганда і растлумачэнне новай Канстытуцыі СССР, матэрыялаў XXV з'езда КПСС, XIII і XVII пленумаў ЦК КПБ.

Прэзідыум педагагічнага таварыства БДУ адобрыў вопыт работы педтаварыства кафедры педагогікі БДУ і прапанаваў пярвічным ячэйкам педтаварыства універсітэта сканцэнтраваць увагу на рашэнні задач, якія пастаўлены ў дакладзе таварыша Л. І. Брэжнева «Аб праекце Канстытуцыі (Асноўнага Закона) СССР і выніках яго ўсенароднага абмеркавання» на сёмай нечарговай сесіі Вярхоўнага Савета СССР, задач, якія вынікаюць з сутнасці новай Канстытуцыі СССР, а таксама даклада таварыша Л. І. Брэжнева «Вялікі Кастрычнік і прагрэс чалавецтва». Разам з гэтым прапанавана пярвічным ячэйкам педтаварыства БДУ ўзмацніць работу па прапагандзе псіхолага-педагагічных і метадычных ведаў сярод студэнтаў, аспірантаў і маладых выкладчыкаў.

**З. ЦІТОК,**
**кандыдат педагагічных навук,**
**ст. выкладчык кафедры педагогікі.**





# Плата за дыплом

«Х'юстанскі універсітэт». Каля дарожнага ўказальніка з такім надпісам машына звярнула з аўтастрады да варот кампуса. За імі на франтоне цэнтральнага універсітэцкага будынка я ўбачыў барэльеф з датай пабудовы — «1927 год».

— Так, нашаму кампусу спаўняецца паўстагоддзя, — расказваў савецкім гасцям віцэ-прэзідэнт універсітэта прафесар Камандэр. Ён гаварыў аб гісторыі і сённяшнім дні ВНУ, якая налічвае 40 тысяч студэнтаў. Падзяліўся ўражаннямі ад трохтыднёвай паездкі ў СССР.

А потым мы задавалі пытанні. Адно з іх — аб кошце вучобы ва універсітэце. Вось што мы даведаліся.

Месца ў інтэрнаце каштуе 1.800 долараў, само навучанне — 450 долараў, навучальныя дапаможнікі — 300, абавязковая медстрахоўка—48, прафесіянальная арыентацыя — 30 долараў, іншыя расходы — 900, расходы ў перыяд летніх канікулаў — 700. Такім чынам, год знаходжання ва універсітэце каштуе 5 тысяч 228 долараў.

Такая сума вельмі вялікая нават для выхадца з сям'і з сярэднім даходам. Універсітэт хутчэй падыходзіць для дзяцей бізнесменаў і высокааплачваемых спецыялістаў.

У аднаго з такіх спецыялістаў я пабываў у гасцях. Клайв, яго жонка Мэрылін, настаўніца сярэдняй школы, і дачка Ева, студэнтка антрапалагічнага факультэта Х'юстанскага універсітэта, жывуць у дастатку. У іх невялікі аднапавярховы дом з гаражом, аўтамабіль, прысядзібны ўчастак. Але, паводле слоў саміх Бекуітаў, ім вельмі нялёгка аплачваць адукацыю дачкі.

— У Х'юстане вучыцца дарагавата, але ўсё ж даступна, — гаворыць Рык Файн, студэнт з іншага тэхаскага горада — Осціна. — Ёсць у ЗША ВНУ намнога даражэйшыя. А ў Гарвардскім або Іельскім універсітэтах кошт навучання значна вышэйшы, чым у правінцыі.

...Плата за дыплом. У ЗША гэта паняцце становіцца ўсё больш актуальным. Аб гэтым мне расказвалі прэзідэнт Нацыянальнай студэнцкай асацыяцыі Том Тобін, выкладчык з Масачусетса Лэры Магід, студэнтка Сіракузскага універсітэта Каці Спагнолі.

Многіх амерыканцаў вельмі цікавіць, як жа арганізавана вышэйшая адукацыя ва ўмовах сацыялістычнага грамадства. Саветолаг Х'юстанскага універсітэта Пол Грэгары, якога не западозрыш у сімпатыях да СССР, зацікавіўся сістэмай размеркавання дыпломнікаў савецкіх ВНУ на работу. Падрабязна распытаўшы нас, ён сказаў:

— Так, у гэтым ёсць свая логіка. У вашай краіне студэнты не плацяць за адукацыю, а наадварот, атрымліваюць стыпендыю...

А вось Джойс Марынелі, васемнаццацігадовая студэнтка каледжа Кен у штаце Нью-Джэрсі, так і не паверыла мне, што ў Савецкім Саюзе вышэйшая адукацыя бясплатная. Выручылі некалькі амерыканскіх студэнтаў, якія пабывалі ў СССР у саставе турысцкіх груп. Яны падышлі да нас. Сумеснымі намаганнямі ўдалося, нарэшце, пераканаць дзяўчыну ў тым, што ёсць у свеце краіна, дзе прынцып «вучыцца можна толькі за грошы» не дзейнічае.

**П. БАГАМОЛАЎ,**
**спец. кар. АДН.**
Нью-Йорк — Масква.

# Метадычныя рэкамендацыі

**Метадычныя рэкамендацыі па правядзенню грамадска-палітычнай атэстацыі студэнтаў БДУ імя У. І. Леніна па выніках другога этапа Ленінскага заліку «Рашэнні XXV з'езда КПСС — у жыццё!» і грамадска-палітычнай практыкі.**

У адпаведнасці з рашэннем V пленума ЦК ВЛКСМ (сакавік 1976 г.) у гады дзесятай пяцігодкі ў камсамольскіх арганізацыях краіны праводзіцца Ленінскі залік «Рашэнні XXV з'езда КПСС — у жыццё!» Залік праводзіцца ў пяць этапаў, кожны з якіх прысвечан знамянальным датам у гісторыі нашай Радзімы, партыі, ВЛКСМ. Штогод па выніках кожнага этапа праводзіцца грамадска-палітычная атэстацыя. Ленінскі залік у цяперашні час стаў важнейшай састаўной часткай усёй сістэмы камуністычнага выхавання моладзі.

Састаўной часткай Ленінскага заліку ў ВНУ з'яўляецца грамадска-палітычная практыка студэнтаў. Рашэннем савета універсітэта ад 21 лютага 1977 года арганізацыя і правядзенне грамадска-палітычнай практыкі і атэстацыя па яе выніках былі сумешчаны з работай па правядзенню Ленінскага заліку. Практыка поўнасцю пацвердзіла правільнасць гэтага рашэння.

Грамадска-палітычную атэстацыю па выніках 1977 года неабходна правесці на працягу лютага 1978 года. Для правядзення гэтага важнага мерапрыемства на высокім арганізацыйна-палітычным узроўні неабходна правесці значную арганізатарскую і прапагандысцкую работу. Трэба перагледзець і зацвердзіць сумесным рашэннем дэканата, партбюро і камітэта камсамола факультэта састаў і старшынь атэстацыйна-метадычных камісій. Камісія ствараецца для кожнай акадэмічнай групы і павінна дзейнічаць на працягу ўсяго года. У састаў камісіі павінны ўваходзіць прадстаўнікі партыйнай арганізацыі, кафедры грамадскіх навук, камітэта камсамола факультэта, а таксама куратар і камсорг групы. Старшынёй камісіі можа быць любы яе член, а калі камісія адначасова з грамадска-палітычнай атэстацыяй падводзіць вынікі і чарговага этапа Ленінскага заліку, то мэтазгодна, каб яе ўзначальвалі прадстаўнікі партыйнай ці камсамольскай арганізацыі. Ацэнка па выніках грамадска-палітычнай практыкі ўносіцца ў ведамасць і заліковую кніжку студэнта ад імя камісіі куратарам групы.

Атэстацыя павінна стаць трыбунай для здаровай, прынцыповай крытыкі і самакрытыкі, сродкам выкаранення недахопаў, выхавання высокай адказнасці за даручаную справу.

Атэстацыйна-метадычным камісіям неабходна звярнуць асаблівую ўвагу на аб'ектыўнасць ацэнкі вынікаў ГПП студэнта. Вопыт мінулага года паказаў, што некаторыя камісіі завышалі ацэнкі па ГПП. У шэрагу выпадкаў ацэнка па ГПП ставілася ў залежнасці ад ацэнкі па грамадскіх навуках. Высокую ацэнку па ГПП часам атрымлівалі студэнты-выдатнікі, хаця ў грамадскай рабоце прымалі недастатковы ўдзел. Студэнтам-выпускнікам ацэнка выстаўлялася не за тую грамадскую работу, якую яны вялі па пятым курсе, а за работу на папярэдніх курсах.

Асновы для індывідуальнага росту кожнага студэнта закладваюцца ў пярвічным калектыве — камсамольскай групе. Таму грамадска-палітычная атэстацыя павінна быць сур'ёзнай праверкай для кожнай камсамольскай групы. Як група ўплывае на якасць засваення ведаў кожным студэнтам, як у групе вядзецца шэфская работа, як арганізуецца вольны час, які ўдзел групы ў жыцці факультэта, універсітэта — усе гэтыя пытанні павінны ставіцца на атэстацыі.

У шэрагу выпадкаў эфектыўнасць атэстацыі зніжаецца неканкрэтнасцю асабістых комплексных планаў «Вучымся камунізму, будуем камунізм!». Замест дакладна намечанай праграмы ўсебаковага развіцця асобы яны часам змяшчаюць абавязацельствы, якія не патрабуюць ад камсамольца ніякіх намаганняў для іх выканання. Гэта перашкаджае вызначыць сапраўдныя магчымасці кожнага, прад'явіць да яго аб'ектыўнае патрабаванне. У сувязі з гэтым ужо ў ходзе грамадска-палітычнай атэстацыі па выніках 1977 года камсамольскія арганізацыі і атэстацыйна-метадычныя камісіі павінны разгарнуць работу па аказанню студэнтам эфектыўнай дапамогі ў складанні асабістых комплексных планаў на 1978 г. План павінен быць канкрэтным, дзейсна ўплываючым на далейшае развіццё асобы, індывідуальным, уключаць мерапрыемствы, абавязацельствы студэнтаў па наступных напрамках: ідэйна-палітычнае выхаванне, прафесійны рост (вучоба і навукова-даследчая работа), удзел у грамадскай рабоце (грамадска-палітычная практыка), маральна-эстэтычнае, фізічнае выхаванне.

У ходзе гэтай работы трэба звярнуць увагу на перапразмеркаванне (у неабходных выпадках) грамадскіх даручэнняў, дабівацца, каб кожны студэнт уключыўся ў актыўную грамадска-палітычную дзейнасць. З гэтай мэтай камсамольскія бюро, атэстацыйныя камісіі павінны мець запас канкрэтных, патрэбных калектыву даручэнняў.

Асабістыя комплексныя планы павінны быць зацверджаны на камсамольскіх сходах да 15 сакавіка 1978 года. На гэтых жа сходах неабходна абмеркаваць вынікі грамадска-палітычнай атэстацыі, звярнуўшы асаблівую ўвагу на індывідуальны рост камсамольца ў ходзе заліку, прааналізаваць выкананне крытычных заўваг, выказаных удзельнікамі заліку на папярэдніх атэстацыях.

Ход і вынікі атэстацыі неабходна шырока асвятляць у насценным друку, газеце «Беларускі універсітэт». На факультэтах мэтазгодна афарміць стэнды «Выдатнікі Ленінскага заліку», лепшых прадставіць да ўзнагароды граматамі камсамольскіх органаў, значком ЦК ВЛКСМ «Ленінскі залік» і г. д.

Партыйныя, камсамольскія арганізацыі павінны зрабіць усё, каб атэстацыя прайшла арганізавана, дакладна, на высокім ідэйна-палітычным узроўні, каб яна стала важным этапам у рабоце па выкананню задач, пастаўленых у Пісьме ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ аб разгортванні сацыялістычнага спаборніцтва.

**РЭКТАРАТ**
**ПАРТКОМ**
**КАМІТЭТ ЛКСМБ.**

# АПЕРАЦЫЯ «ЗДАРОЎЕ»

Тое, што заняткі спортам прыносяць карысць, агульнавядома. Але ці заўсёды ў выкладчыкаў, супрацоўнікаў, служачых і рабочых ВНУ знойдуцца час і сіла волі, каб заняцца спортам? Наўрад ці можна станоўча адказаць на гэтае пытанне. У заняткі спортам трэба ўцягваць. Да плавання ці тэніса трэба далучаць. Для лыжных гонак ці валейбольных сустрэч ствараць умовы.

У мінулым навучальным годзе спартыўна-масавая камісія мясцкома БДУ актыўна займалася гэтым далучэннем і ўцягваннем. Дастаткова адзначыць, што цэнтральныя спартыўныя секцыі БДУ наведвала больш як 320 чалавек. Былі арганізаваны групы па падрыхтоўцы і здачы нарматываў ГПА на факультэтах і ў падраздзяленнях універсітэта. Колькасць значкістаў ГПА павялічылася за год на 242 чалавекі. Дарэчы, вялікую работу па падрыхтоўцы значкістаў правялі хімфак, ВЦ, НДІ, ПФП. На хімфаку 80 працэнтаў выкладчыкаў і супрацоўнікаў здалі нормы комплексу ГПА.

Сярод выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта была праведзена VI спартакіяда «Здароўе», прысвечаная 60-годдзю Вялікага Кастрычніка. У спартакіядзе (13 відаў спорту) прыняло ўдзел больш як 700 чалавек. Паспяхова выступілі спартсмены ВЦ, радыёфізічнага факультэта, ФПМ і г. д. Высокіх вынікаў дабіліся прадстаўнікі — хімфака С. Рахманаў (лёгкая атлетыка), кафедры фізвыхавання Д. Петухоў, В. Фралоў, В. Кавалёў (цяжкая атлетыка), НДІ ПФП М. Батурыцкі (лёгкая атлетыка) і многія іншыя.

Першае месца ў комплексным заліку спартакіяды заняла прафсаюзная арганізацыя вылічальнага цэнтра; яна ўзнагароджана пераходным кубкам і граматай мясцкома. На другім месцы — прафарганізацыя радыёфізічнага факультэта, на трэцім — ФПМ.

Мясцкомам неаднойчы праводзіліся таварыскія сустрэчы са спартыўнымі камандамі выкладчыкаў і супрацоўнікаў ВНУ Мінска, турыстычныя паходы па месцах баявой і працоўнай славы савецкага народа.

У плане аздараўленчай работы было створана 6 груп здароўя (311 чалавек); на возеры Нарач адпачыла каля 70 супрацоўнікаў БДУ.

Разам з тым у рабоце спартыўна-масавай камісіі мясцкома універсітэта ёсць яшчэ пэўныя недахопы і нявыкарыстаныя рэзервы. Аб гэтым сведчыць такі факт: у прафарганізацыі АГЧ сярод 450 чалавек не было падрыхтавана за год ніводнага значкіста ГПА. Недастаткова актыўна вялася работа па здачы норм ГПА на біяфаку, гістфаку, філфаку, мехмаце, у прафарганізацыях кафедр грамадскіх навук, ІПК. Нам трэба прыкласці шмат намаганняў, каб ліквідаваць хібы і ўзняць спартыўна-масавую і аздараўленчую работу на яшчэ больш высокі ўзровень.

**В. КУКЛІН.**



# У СПОРТА СВАЯ ГІСТОРЫЯ

**У музеі Алімпіі (у той самай даліне бурнага некалі Алфея, дзе нарадзіліся Алімпійскія гульні элінаў) захоўваецца вялікі камень. Няправільны па форме, згладжаны часам, вадой і чалавечымі рукамі, ён напамінае гіганцкую каменную гіру, вага якой — 143,5 кг.**

**Сам па сабе гэты факт наўрад ці быў бы варты напамінання (ці мала вялікіх каменняў на зямлі!), калі б не надпіс на антычнай гантэлі: «Бібон падняў мяне над галавой адной рукой». Атлет, які насіў гэтае імя, жыў у VI ст. да н. э. І выжаў ён не штангу (за яе грыф можна зручна ўзяцца), а прадаўгаватую каменную глыбу, збалансіраваць якую нялёгка.**

* * *

**А ці ведаеце вы, як узнікла слова «акадэмія»? З самых старажытных часоў так называўся гай, прысвечаны афінскаму герою Акадэму. Тут займаліся спортам юнакі, тут жа прагульваўся і вёў размовы са сваімі вучнямі элінскі філосаф Платон. Яго паслядоўнікі і сталі першымі «акадэмікамі». Але афінская акадэмія праславілася яшчэ і тым, што адсюль звычайна пачыналася самае цікавае спаборніцтва бегуноў — лампададромія (бег з факелам).**

**У гаі знаходзіўся ахвярнік Праметэя — тытана, які падараваў людзям агонь. Іменна каля яго глыбокай ноччу бегуны запальвалі васковыя факелы і, моцна трымаючы іх у руцэ, імчаліся да горада. Факел перадаваўся ад аднаго бегуна да другога (як у сучаснай эстафеце). Выйгравала каманда, удзельнік якой першым, не пагасіўшы агню, дабягаў да жылля пекара або каваля. Там па старыннай традыцыі ён сваім факелам распальваў печ.**

* * *

**Вядомы элінскі атлет і асілак Мілон з горада Кротана быў непераможны ў барацьбе. На працягу 20 гадоў ён 6 разоў заваёўваў вянок пераможцы на Алімпійскіх гульнях.**

**Упершыню Мілон перамог у 532 г. да н. э., а шосты вянок з кветак алівы ён атрымаў у 516 г. да н. э.**

**Расказваюць, што ў дзяцінстве і юнацтве Мілон, як і шматлікія яго аднагодкі, быў пастухом. Ён любіў раніцай, узняўшы над галавой цяля, абносіць яго вакол роднага горада. Ішлі гады. Цяля расло. Расла і моц будучага алімпійца. І ў адзін цудоўны дзень ён выклікаў усеагульнае захапленне, калі на плячах перанёс праз поле стадыёна ў Алімпіі чатырохгадовага быка.**

**У маладосці Мілон быў вучнем Піфагора. Ён наведваў вядомага матэматыка і філосафа на працягу некалькіх гадоў. Аднойчы ў час заняткаў стала абвальвацца апорная калона жылля Піфагора. Каб папярэдзіць катастрофу, Мілон сам устаў на месца калоны і да таго часу падтрымліваў звод будовы, пакуль усе не аказаліся ў бяспецы.**

# Лекцыі ў час адпачынку







Закончылася вучоба активу СНТ рэспублікі, якая праходзіла ў час зімовых студэнцкіх канікулаў на турбазе ЧБВА «Ждановічы». Як мы паведамлялі, базавай установай вучобы быў наш універсітэт. Студэнты усіх ВНУ БССР добра адпачылі і ў той жа час праслухалі цыкл лекцый выкладчыкаў БДУ.

**На здымках:**

з цікавасцю слухаюць прысутныя лекцыі па розных галінах навукі;

лекцыю чытае кандыдат філалагічных навук **М. Яфімава;**

«але папярэджваю, мой расказ пра ЗША будзе крыху суб'ектыўным», — гаворыць актывістам СНТ дэкан хімічнага факультэта БДУ **Г. Браніцкі.**

Фотарэпартаж **А. Багданава.**



**ТЭАТРАЛЬНЫ АБАНЕМЕНТ ДЛЯ СТУДЭНТАЎ І СУПРАЦОЎНІКАЎ УНІВЕРСІТЭТА**

**21 лютага** (опера) А. Даргамыжскі. «Русалка».

**15 сакавіка** (балет) Ж. Бізэ, Р. Шчадрын. «Кармэн-сюіта», «Шапеніяна».

**28 красавіка** (балет) С. Пракоф'еў. «Рамэо і Джульета».

май (балет) Я. Глебаў. «Ціль Уленшпігель».

За абанементам звяртацца ў камітэты камсамола факультэтаў (сектар ідэйна-маральнага і эстэтычнага выхавання).

**Клуб аматараў тэатра.**




**У паліклініцы БДУ 22—23 лютага 1978 г. з 10.00 да 16.00 будзе праводзіцца Дзень донара.**

**Бясплатная дача крыві для выратавання жыцця хворых з'яўляецца высокагуманным і высакародным учынкам.**

**Чакаем вас на донарскім пункце.**

**КАМІТЭТ ТАВАРЫСТВА ЧЫРВОНАГА КРЫЖА.**

# НОВЫЯ КНІГІ



**У КАБІНЕТ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫХ І ГІСТАРЫЧНЫХ НАВУК ПАСТУПІЛА НАСТУПНАЯ ЛІТАРАТУРА:**

**Філасофія. Атэізм.**

Сучасная буржуазная філасофія і рэлігія. Пад рэд. **А. С. Багамолава.** М., Палітвыдавецтва, 1977.

**Баграмаў Э. А.** Ленінская нацыянальная палітыка: дасягненні і перспектывы. М., «Мысль», 1977.

НТР і сацыяльна-этычныя праблемы. М., «Мысль», 1977.

**Зародаў К. І.** Сацыялізм, мір, рэвалюцыя. Некаторыя пытанні тэорыі і практыкі міжнародных адносін і класавай барацьбы. М., Палітвыдавецтва, 1977.

**Штракс Г. М.** Сацыяльныя супярэчнасці. М., «Мысль», 1977.

Метадалагічныя праблемы грамадскіх навук. Вып. 5. Роля навуковых прынцыпаў і паняццяў у сацыяльным даследаванні. Пад рэд. **Г. А. Падкарытава.** Л., Выд-ва ЛДУ, 1976.

**Аўтаномава Н. С.** Філасофскія праблемы структурнага аналізу ў гуманітарных навуках. (Крытычны нарыс канцэпцый французскага структуралізму). М., «Мысль», 1977.

**Сцяпанаў Н. І.** Канцэпцыі элементарнасці ў навуковым пазнанні. М., «Наука», 1976.

**Авяр'янаў А. Н.** Сістэма: філасофская катэгорыя і рэальнасць. М., «Мысль», 1976.

**Турсунаў Акбар.** Філасофія і сучасная касмалогія. М., Палітвыдавецтва, 1977.

**Дзёмін М. В.** Праблемы тэорыі асобы. (Сацыяльна-філасофскі аспект). М., Выд-ва МДУ, 1977.

Праблемы сацыялістычнага ладу жыцця. Рэд. кал.: **М. Н. Руткевіч** (адк. рэд.) і інш. М., «Наука», 1977.

**Гіндзеў Панайот.** Філасофія і сацыяльнае пазнанне. Пер. з балг. М., «Прогресс», 1977.

**Чаркасаў І. І.** З гісторыі марксісцкай філасофскай думкі ў ЗША. (Ад І. Вейдэмейера да нашых дзён). М., «Наука», 1977.

Эўрыстычная і прагнастычная функцыі філасофіі ў фарміраванні навуковых тэорый. Пад. рэд. **Ф. Ф. Вякерава** і **В. П. Брагінскага.** Л., Выд-ва ЛДУ, 1976.

Філасофія ў пытаннях і задачах (дыялектычны матэрыялізм). Пад рэд. **Г. В. Платонава** і **Н. В. Хорава.** М., Выд-ва МДУ, 1977.

**Разін В. І.** Агульная методыка выкладання філасофіі ў ВНУ. Метадычны дапаможнік для выкладчыкаў. М., «Высшая школа», 1977.

Атэізм і сучаснае прыродазнаўства. М., Выд-ва МДУ, 1977.

Пытанні навуковага атэізму. Вып. 21. Атэізм і рэлігія ва ўмовах сацыялістычнага грамадства. М., «Мысль», 1977.

**Пінчук Л. Т.** Ільін дзень. Выд. 3. М., Палітвыдавецтва, 1977.

**Н. СЛАВІНСКАЯ.**

**Рэдактар А. ДЗЕРАШ.**

**НАШ АДРАС** **220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.**

Заказ № 272 Тыраж 2000 экз. **Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.** АТ 01708